# 4. ФРАЗЕОЛОГИЧЕСКИЕ ЕДИНИЦЫ В СЕМАНТИКО-ГРАММАТИЧЕСКОМ АСПЕКТЕ

*І.І. Баравая, Я.Я. Іваноў (Магілёў)*

## СІНТАКСІЧНАЯ СТРУКТУРА СУЧАСНАГА БЕЛАРУСКАГА ЛІТАРАТУРНАГА АФАРЫЗМА

У беларускім мовазнаўстве пад афарызмам разумеецца «выказванне, якое перадае лагічна закончаную думку (суджэнне) – жыццёвае назіранне, заклік, маральную сентэнцыю, параду, разважанне і г. д., выражаную абавязкова ў яскравай, трапнай і лаканічнай слоўнай форме» [1, с. 60]. Афарызм таксама трактуецца як «выслоўе, якое ў трапнай лаканічнай форме выказвае значную і арыгінальную думку» [2, с. 229].

А.Я. Міхневіч адасоблівае афарызмы, з аднаго боку, ад прыказак, якія ў адрозненні ад афарызмаў не маюць канкрэтнага аўтара або шырока вядомай крыніцы (эпічнага твора, рэлігійнага помніка), а з другога, ад крылатых слоў, якія больш шырока ўжываюцца ў маўленні і ў склад якіх уваходзяць не толькі завершаныя думкі, але і трапныя найменні [1, с. 60]. Вучоны размяжоўвае афарызмы, якія складаюць асобныя, цэлыя літаратурныя творы, і афарызмы, якія ўваходзяць у склад іншых твораў.

Ф.М. Янкоўскі сярод афарызмаў вылучае крылатыя выразы з навукова-публіцыстычных, філасофскіх, мастацкіх твораў і народныя прыказкі. Афарызмы могуць існаваць як самастойныя мініяцюрныя творы, могуць уваходзіць у аўтарскі кантэкст, пры гэтым сам кантэкст не становіцца афарыстычным [2, с. 229].

Паводле сінтаксічнай структуры беларускія літаратурныя афарызмы вельмі разнастайныя. Яны могуць быць прадстаўлены простымі і складанымі сказамі розных тыпаў.

(1) Простыя сказы ў афарызмах бываюць: (1.1) не ўскладнёныя: *Адны жабракі могуць праз усё жыццё толькі браць* (М. Багдановіч);

(1.2) ускладнёныя: (1.2.1) аднароднымі членамі: *Лес шумеў і будзе шумець* (Я. Брыль); (1.2.2) адасобленымі канструкцыямі: *Праўда, прыкрытая дзяружкаю, цікавей за голую праўду* (Я. Колас); (1.2.3) зваротkam: *А каб ты смалы наеўся, гад!* (Я. Колас).

Простыя сказы ў афарызмах могуць быць прадстаўлены:

(1.3) двусастаўнымі сказамі: *Замужаства адкрывае жанчыне вочы на самую сябе* (К. Чорны);

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

(1.4) аднасастаўнымі сказамі, якія падзяляюцца на: (1.4.1) пэўна-асабовыя: *Ніколі не марнуйце чужога жыцця і шчасця* (Я. Колас); (1.4.2) няпэўна-асабовыя: *На гонары далёка не заедзеш* (І. Шамякін); (1.4.3) абагульнена-асабовыя: *Кідай безработную службу!* (Ядвігін Ш.); (1.4.4) інфінітыўныя: *Цяжка стаяць над магілаю свайго жыцця і пазіраць на яго развалiны* (Я. Колас).

(2) Сказы, якія паводле сваёй сінтаксічнай структуры з'яўляюцца складанымі, падзяляюцца на:

(2.1) бяззлучнікавыя: *Чалавек – не канцылярская паперка: нумар наставіў, падшыў, зарэгістраваў і ўсё тут* (Я. Колас).

(2.2) злучнікавыя: *Няма на свеце такое сілы, над каторай не было б большае сілы* (Я. Колас). Сярод іх: (2.2.1) з злучальнай сувяззю: *Глядзі наперад, пазірай назад і абводзь вачамі вакол сябе, і ты ніколі не прападзеш* (Я. Колас); (2.2.2) з падпарадкавальнай сувяззю: *Дзякуй богу, што бог сярдзітым людзям не дае многа сілы* (Я. Колас).

(2.2.2.1) з дапамогай займенніка: *Які вялікі цяжар нясе на плячах той, за якога хоча трымацца многа людзей!* (К. Чорны);

(2.2.2.2) з дапамогай злучніка з даданымі сказамі наступных тыпаў: (2.2.2.2.1) азначальнымі: *Добра быць у дарозе, якую ты сам сабе выбіраеш* (Я. Колас); (2.2.2.2.2) умовы: *Як добра было б жыць на свеце, калі б чалавека не гналі, не крыўдзілі, не пазбаўлялі волі, не звязвалі крылляў* (Я. Колас); (2.2.2.2.3) часу: *Добра быць аднаму ў дарозе, асабліва тады, калі надвор'е спрыяе табе, а на сэрцы спакойна, і нішто не абцяжарвае твае душы...* (Я. Колас); (2.2.2.2.4) месца: *Там, дзе пачынаецца абыякавасцю, там недалёка гібель* (К. Чорны); (2.2.2.2.5) мэты: *Каб выказаць разумную думку, не трэба многа прыгожых і выкрутасістых слоў* (Я. Колас); (2.2.2.2.6) прычыны: *Ніколі не страціць для нас цікавасці чалавек, бо праяўленне яго розуму бязмежна, бо дарогі яго не вызначаны, бо формы яго жыцця і яго адносіны да другіх людзей бясконца разнастайныя, канчаткова не выяўлены і ніколі не могуць стаць канчатковымі* (Я. Колас).

Колькасны аналіз (200 адзінак, атрыманых з дапамогай выпадковай выбаркі з мастацкіх твораў розных пісьменнікаў) паказаў, што беларускія літаратурныя афарызмы найчасцей прадстаўлены простымі двусастаўнымі неўскладнёнымі сказамі. Простыя сказы ў афарызмах ускладняюцца часцей за ўсё аднароднымі членамі і адасобленымі канструкцыямі. Сярод простых аднасастаўных сказаў у найбольшай колькасці сустракаюцца афарызмы, якія прадстаўлены пэўна-асабовымі сказамі. Сярод афарызмаў, прадстаўленых складанымі сказамі, пераважаюць афарызмы, выражаныя складанымі злучнікавымі сказамі. Сярод афарызмаў, якія з'яўляюцца складаназалежнымі сказамі са злучнікавай сувяззю, часцей за астатнія сустракаюцца сказы з даданымі ўмовы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Літаратура

1. Міхневіч А.Я. Афарызмы // Беларуская мова: Энцыкл. / Пад рэд. А.Я. Міхневіча; Рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелЭн, 1994. – С. 60-61.

2. Янкоўскі Ф.М. Афарызм // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. / Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БСЭ, 1984. – Т. 1. – С. 229.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова